Тарановіч Т.П.,
студэнтка лінгвістычнага факультэта
Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта
Навуковы кіраўнік: доктар філалагічных навук,
дацэнт, прафесар кафедры філалогіі
Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Белая А. І.

МАСТАЦКІЯ АДЗНАКІ «ПЕРАКУЛЕНАГА СВЕТУ» Ў ТВОРАХ ПРА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

У межах данага артыкула мы звярнуліся да аповесці беларускага класіка Якуба Коласа «Адшчапенец» (1932) і паэмы рускага аўтара Аляксандра Твардоўскага «Краіна Муравія» (1934-36). Гэтыя творы прысвечаны тэме калектывізацыі. Рэаліі зменлівай, рухомай, дынамічнай рэчаіснасці пераходнага перыяду адбіваюцца на ўласцівасцях мастацкага вобраза свету, які часта выяўляецца перайначаным, «перакуленым». Метафару «перакулены свет» выкарыстоўвае ў рамане «Язэп Крушынскі» выдатны беларускі празаік Змітрок Бядуля. На нашу думку, яна па сваёй сутнасці адпавядае паняццю «абсурд», якое яшчэ ў грэчаскай філасофіі выступала супрацьлегласцю лагічнага мыслення, катэгорый прыгожага і высокага, праявай экзістэнцыйнага перажывання гістарычнага крызісу. У паэме А. Твардоўскага ёсць такая метафарычная характарыстыка пераходнай эпохі: *И жизнь -на слом, / И все на слом -/ Под корень, подчистую* [4, с. 34].

Адной з прыватных яскравых адзнак перакуленага свету ў паэме «Краіна Муравія» выступае цыганскі калгас. Цыганы як этнічная група спрадвеку вялі вандроўны спосаб жыцця, захоўвалі трывалую сацыяльную структуру. Жанчыны займаліся гаданнем, папрашайніцтвам, знахарствам, клапаціліся пра забеспячэнне сям'і харчаваннем. Заняткі мужчын - гандаль коньмі, канавальства, рамёствы (кавальства, пляценне кашоў, разьба па дрэве і інш.), канакрадства [5, с. 522]. Галоўны герой паэмы «Краіна Муравія» Мікіта Маргунок -селянін, які адпраўляецца на сваім кані ў пошукі той мясцовасці, дзе няма калгасаў. У час падарожжа яго каня скралі. Нядоўга думаючы, Мікіта накіраваўся ў цыганскі калгас, але каня там не знайшоў. Тады яму прыйшла думка скрасці аднаго з цыганскіх коней, кіруючыся наступным разважаннем: «*Лошадей цыгане крали? -/ Крали. - Испокон веков у всех? -У всех…»* [4, с. 49]. І ўсё ж Мікітава сумленне не дазволіла зрабіць гэтага.

Гісторыя пра цыганскі калгас у паэме «Краіна Муравія» не з'яўляецца вымыслам. А. Твардоўскі апісвае яго стварэнне як адзін з эксперыментаў савецкага часу на роднай пісьменніку Смаленшчыне. На тэрыторыі Смаленскай вобласці налічвалася 25 цыганскіх калгасаў [2, с. 187].

Аднак калгасны цыганскі рух, які развіваўся ў межах савецкай палітыкі, даў толькі адзінкавыя вынікі. Паводле некаторых ацэнак, цыганскі калгас увасабляе ідэал новых чалавечых адносін. Аднак развагі галоўнага героя паэмы прымушаюць усумніцца ў гэтым*: Знал Никита Моргунок / Правило простое, / Что медведь блинов не пек, / Волк двора не строил. / Удивился Моргунок, видит: на поляне / Ходят вдоль и поперек / С косами цыгане* [4, с. 45-46]. Пры гэтым мянташку яны трымаюць не так, як прынята спрадвеку, *не по форме вроде.* І гэтая дэталь таксама разбурае ідылічную карціну, як і тое, што на цыганскім падворку *из соломы ворота лыком запечатаны*. У сярэднім існаванне цыганскага калгаса працягвалася не больш за адзін год. Цыганскія калгасы не сталі прыкладам паспяховай палітыкі калектывізацыі ў СССР [2, с. 224].

Аповесць «Адшчапенец» была напісана Якубам Коласам ў 1930–1931 гг., у той час, калі ў краіне адбываўся бурны працэс перабудовы сельскай гаспадаркі. Адзін з герояў аповесці Якуба Коласа«Адшчапенец» -моцны гаспадар Ігнат Чыкілевіч, які раней за ўсіх адчуў подых небяспекі для такіх, як ён, уласнікаў. Таму Чыкілевіч *яшчэ з восені выкапаў патайны пагрэбок у сваёй клуні і ў гэтым пагрэбку хаваў кубел сала, дзве кадушачкі крупы і іншы свой скарб. Быў у яго добры япрук, і ён закалоў яго нядаўна. Каб людзі не ведалі аб гэтым <...> Чыкілевіч асмаліў япрука ў пограбе* [3, с. 175]. Аналізуючы персанажную сферу беларускай прозы першай трэці XX ст., А. І. Белая сцвярджае, што матыў «асоба і ўласнасць» рэалізуецца і ў такім тыпе персанажа, як злодзей. Даследчыца вылучае такія тыпы гэтага персанажа, як лясны злодзей; «злодзей паняволі", змушаны да пакражы невыноснымі ўмовамі жыцця; дасціпнага розуму махляр, што ўзыходзіць да архетыпу круцяля, ашуканца, трыксцера; злодзей, што крадзе ў цягніках, канакрад. Кулака Чыкілевіча ліхая доля прымусіла стаць злодзеем, які думае пра тое, як абкрасці самога сябе -дапяць да дабра, што схаваў на чорную часіну. Баронячы яго, Ігнат кінуўся на калгасных актывістаў з сякерай [1, с. 136-138]. Якуб Колас не каментуе і не рэзюмуе гэтую сітуацыю. Але аўтарскі аповед прымушае задумацца: рэчаіснасць, якая змушае чалавека да такога абсурднага ўчынку, - ці не ёсць гэта той самы перакулены свет?

Такім чынам, калектывізацыя стала вялікім пераломам у лёсе працоўнага сялянства. Сумленныя творцы імкнуліся праўдзіва адлюстраваць як трагізм эпохі, сучаснікамі якой яны былі, так і яе абсурднасць, аб чым сведчаць згаданыя ў артыкуле штрыхі да аблічча «перакуленага свету».

Літаратура:

1. Белая, А. І. Беларуская проза першай трэці XX ст. : станаўленне сістэмы персанажаў, тыпы і эвалюцыя мастацкіх характараў : манаграфія / А. І. Белая ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранавіцкі дзярж. ун-т. – Баранавічы : БарДУ, 2018. – 352 с.

2. Килин, А. П. Политика перевода цыган на оседлый образ жизни: проблемы реализации (1926–1937) // Документ. Архив. История. Современность: сб. науч. тр. Вып. 5. - Екатеринбург, 2005. - 227 с.
3. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Якуб Колас ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. - Мінск : Беларус. навука, 2010. - Т. 12 : Аповесці. - 518 с.
4. Твардовский, А.Т. Поэмы / А. Т. Твардовский. - Пермь : Кн. Изд-во, 1973. - 496 с.
5. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. - Мінск: БелСЭ, 1989. - 575 с.

Чайчыц Г.М.,
студэнт кафедры філалогіі
Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык
кафедры філаллогіі Косціна Ж.В.

ТВОР ЯНА ЧАЧОТ «СПЕВЫ ПРА ДАЎНІХ ЛІЦВІНАЎ ДА 1434 ГОДА» ЯК ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАЙ БЕЛАРУСІ У ПЕСНЯХ

«Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» -гэта паэтычная хроніка падзей паганскай Літвы, як некалі называлі ў асноўным землі цэнтральнай і заходняй часткі Беларусі. Іх можна аднесці да жанру гістарычных песень, у якіх адлюстраваны рэальныя гістарычныя падзеі, асобы, звязаныя з канкрэтнымі мясцінамі, абставінамі, часам».

Ян Чачот задумаў гэты цыкл гістарычных спеваў яшчэ ў філамацкі, ці віленскі перыяд свайго творчага шляху, што відаць з яго пісьма да Адама Міцкевіча ад 22 сакавіка (3 красавіка) 1823 года, у якім можам заўважыць наступныя словы: «Думаю паспрабаваць пісаць пра Вітаўта, Альгерда, Кейстута і іншых. Пра іх можна болей гаварыць, чым пра жанчын, трэба паказваць усе іх дзеі. Пагляджу, як гэта мне ўдасца. Добра б было, каб гэтыя творы не толькі можна было чытаць, але і спяваць. Яны маглі б выклікаць тады большы эфект…» [3, с. 324]. Але гэтая ідэя здзейснілася пасля таго, як Ян Чачот вярнуўся з высылкі.

Толькі ў апошні час сталі вядомымі тэксты цыкла Чачота «Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» (1842–1844). Ён уключае больш за 50 твораў баладнага тыпу. Гэта паэтычная гісторыя ВКЛ, напісаная з мэтай увасабіць славу продкаў, папулярызаваць айчынную гісторыю. Цыкл планавалася выконваць пад музыку.

Спачатку Ян Чачот хацеў паказаць славутых жанчын мінулага, у першую чаргу «ліцвінак», але потым вырашыў наогул напісаць паэтычную гісторыю сваёй Бацькаўшчыны часоў Вялікага Княства Літоўскага.

Як зазначаюць многія навукоўцы: «Свае “Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года” аўтар прысвяціў Марыі (Марылі) Верашчацы, каханай яго сябра Адама Міцкевіча, шчырай сяброўцы ўсіх філаматаў, з якой Чачот заўсёды дзяліўся сваімі думкамі, якой пасылаў, гэтак жа, як і Зосі Малеўскай, тэксты ўласных песень для выканання іх на фартэпіяна» [3, с. 325]. Відаць, паэт спадзяваўся, што і «Спевы пра даўніх ліцвінаў» будуць нейкім чынам спявацца.

«Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 года» адлюстроўваюць розныя старонкі гісторыі ВКЛ і расказваюць пра цікавыя моманты з жыцця вядомых гістарычных асоб. «Аўтар імкнуўся перадаць каларыт даўніны» [2, с. 91]. Пісаў пра Альгерда, Вітаўта, Кейстута, Ягайлу іншых рэальных і легендарных князёў.

Да прыкладу: у песні «Разлад Вітаўта з Ягайлам» ёсць і ўводзіны да гістарычнага аповеду, і высновы з урокаў гістарычнай маралі:

Горш няма, чым сварка дома,
Брат ідзе на брата,
Пэўна ўжо ад калатнечы
Прападзе іх хата.
Тут навука для нашчадкаў
Хай заб’е трывогу:
Хто ж ваюе дома й кліча
Ворага ў падмогу! [1, с. 196]

Ян Чачот пісаў свае «Спевы» абапіраючыся на гістарычныя факты, узятыя з «Хронікі польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі» Мацея Стрыйкоўскага і дзевяцітомнай «Гісторыі літоўскага народа» Тэадора Нарбута. Аўтар пазначае нават старонкі гэтых выданняў, адкуль ён браў факты для сваіх «Спеваў пра даўніх ліцвінаў да 1434 года».

Сёння беларускія гісторыкі пераканаўча паказваюць памылковасць многіх момантаў гэтай працы Яна Чачот, таму што не мог крытычна падыйсці да летапісных звесткаў, адсюль -і яго памылкі. Але трэба аддаць належнае аўтару, што гістарычныя факты ён апрацоўваў як мастак, акцэнтуючы ўвагу больш на маральнае аблічча сваіх герояў.